*І. А. ВІДАНАВА, аспірантка БДУ*

# ЗНАЧЭННЕ ПЕРЫЯДУ ФЕАДАЛЬНАЙ ДРОБНАСЦІ Ў СЯРЭДНЯВЕЧНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Асноўная ўвага навукоўцаў да гісторыі Беларусі доўгі час канцэнтравалася на дзяржаваўтваральным працэсе, ягоных ключавых момантах і бесперапыннасці. Гэтым абумоўлены і традыцыйны для беларускай гістарыяграфіі падыход да перыядызацыі старажытнай гісторыі Беларусі, дзе асноўным прынцыпам пры выдзяленні асобных гістарычных перыядаў ёсць час з'яўлення на беларускіх землях пэўнага дзяржаўнага ўтварэння (Полацкага княства, Вялікага княства Літоўскага, Вялікага княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай і г. д.). Такі падыход да перыядызацыі гісторыі Беларусі ў цэлым, і

беларускага сярэднявечча ў прыватнасці, не прадугледжвае звароту да якасных зменаў, якія адбываліся ў грамадскіх адносінах і ў тыя перыяды, калі дзяржаваўтваральны працэс, на першы погляд, быў запаволеным. Так, часам якасных зменаў у грамадскіх адносінах на тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца XII–XIII ст., аднак вызначаныя яшчэ ў дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі як перыяд феадальнай дробнасці, гэтыя стагоддзі заставаліся па-за пільнай увагай навукоўцаў і як бы выключаліся з агульнага рэчышча беларускай гісторыі.

Следствам акрэсленага вышэй падыходу да гісторыі Беларусі з пункту гледжання станаўлення тут сваёй дзяржаўнасці з'яўляецца тое, што перыяд феадальнай дробнасці разглядаецца не як самастойны этап, а як частка папярэдняга Полацкага альбо наступнага перыяду ўтварэння Вялікага княства Літоўскага. Яшчэ адной прычынай слабай даследаванасці XII–XIII ст. можна назваць адсутнасць дастатковай колькасці крыніцаў, а таму надзвычай складана па магчымасці поўна рэканструяваць мадэль грамадскай арганізацыі, што існавала на беларускіх землях у гэты час, яе палітычнай, сацыяльнай і эканамічнай падсістэмаў. Магчыма таму пераважная большасць даследванняў дадзенага перыяду як дарэвалюцыйных, так савецкіх і ўласна беларускіх аўтараў прысвечана перш за ўсё пераліку вядомых па летапісах падзеяў, узнаўленню іх храналагічнай паслядоўнасці без глыбокага асэнсавання сутнасных зменаў у дзяржаўнай структуры.

Усё вышэй пералічанае стала прычынай недаацэнкі ролі перыяду феадальнай дробнасці ў эвалюцыі грамадскіх адносінаў на Беларусі, слабай даследаванасці гэтага гістарычнага этапу і памылковых высноваў адносна яго сутнасці і значнасці.

Мэтай дадзенага даследвання з'яўляецца комлексны аналіз развіцця рэгіянальных цэнтраў на беларускіх землях у XII ст. шляхам параўнання сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця найбольш буйных рэгіянальных цэнтраў на тэрыторыі Беларусі, такіх як Полацак, Менск, Пінск і Навагрудак.

Пачатак перыяду феадальнай дробнасці на Беларусі прынята звязваць са смерцю князя Усяслава Полацкага. Адзінай прычынай распачаўшагася пасля яе драблення Полацкага княства нельга называць толькі вялікую колькасць спадчыннікаў, бо любое раннефеадальнае дзяржаўнае ўтварэнне дасягае ў выніку свайго развіцця найвышэйшага росквіту. У гэты час назіраецца не толькі актыўная заваёўніцкая палітыка і агульнае ўзбуйненне дзяржавы, але і моц-

ная асоба ўладара, які, дзякуючы сваім асабістым якасцям і спрыяльнай палітыка-эканамічнай кан'юнктуры, утрымлівае яе ў адзінстве. Аднак адначасова ўзрастае і магутнасць адрозных ад цэнтра гарадоў, якія паспяхова развіваліся на фоне агульнадзяржаўнага дабрабыту. Іх і атрымаюць у якасці ўдзелаў нашчадкі Усяслава Полацкага, кожны з якіх будзе імкнуцца авалодаць вярхоўнай уладай над усімі астатнімі.

Параўнальны аналіз эканамічнага развіцця названых вышэй цэнтраў паказаў, што перыяд феадальнай дробнасці вызначаецца эканамічным ростам, а не заняпадам. Пры гэтым эканамічнае развіццё Полацка, Менска, Пінска і Наваградка ў XII ст. ішло прыкладна аднолькавымі тэмпамі, што сведчыць аб перавазе палітычнага фактара над эканамічным у працэсе пераразмеркавання палітычнай улады на беларускіх землях.

Што тычыцца палітычнага жыцця, то адразу трэба зазначыць, што тэрыторыю Беларусі абмінула мангола-татарская навала, якая ў іншых краінах Усходняй Еўропы ўнесла свае карэктывы ў іх феадальную гісторыю. Трэба зазначыць, што перыяд феадальнай дробнасці мог скончыцца, напэўна, значна раней на Полаччыне. Бо вельмі хутка вызначыўся новы лідэр на яе тэрыторыі — Менск і яго ўладар князь Глеб. Аднак, заваёўніцкая палітыка апошняга закранула інтарэсы магутнага суседа — Кіеўскага княства, дзе ў гэты час пачаў кіраваць Уладзімір Манамах. Таму, ужо ў 1117 г. Менск выбыў з барацьбы. Адначасова з гэтымі падзеямі стала відавочна, што сам Полацак не здолее аднавіць сваю былую магутнасць: побач з феадальнымі міжусобіцамі на ваенную арэну выходзяць крыжакі, а да гэтага часу актывізаваліся і літоўскія плямёны. Пінскае княства заставалася лідэрам Турава-Пінскай зямлі, але не магло прэтэндаваць на ролю аб'яднальніка пераважнай часткі беларускіх земляў з прычыны своеасаблівай мадэлі палітычна-тэрытарыяльнай структуры.

Да асаблівасцяў развіцця рэгіянальных цэнтраў на беларускіх землях у перыяд феадальнай дробнасці адносіцца і відавочны яго падзел на два этапы: да выгнання Усяславічаў з Полаччыны ў Канстанцінопаль і пасля аднаўлення ўлады дынастыі на Полацкай зямлі. Гэтыя два этапы істотна адрозніваюцца адзін ад другога, і, адначасова, указваюць на адрознасць перыяду феадальнай дробнасці на Беларусі ад аналагічных працэсаў у іншых славянскіх землях (у тым ліку ў Кіеўскай Русі).

Такім чынам, час феадальнай дробнасці павінен разглядацца як самастойны перыяд у гісторыі Беларусі. У сваю чаргу, XII–першая палова XIII ст. — гэта час істотных зменаў у грамадскіх адносінах, характэрных для ўсяго рэгіёна, замацавання новых прававых нормаў, а таксама складвання перадумоваў да змены палітычнага цэнтра, гэтаксама як і самой мадэлі дзяржаўна-палітычнай арганізацыі тагачаснага грамадства.